# СЕННЯ—ВЯЛІКАЕ СВЯТА ПЕРАМОГІ.

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*
Камуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі

Орган Бабруйскага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных

# Савецкая РАДЗІМА

№ 76 (103)
СЕРАДА 9 МАЯ 1945 г.
Цана 20 кап.



## УКАЗ
### *Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР*
### Аб аб'яўленні 9 мая святам перамогі

**У азнаменаванне пабеданоснага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны совецкага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і атрыманых гістарычных перамог Чырвонай Арміі, якія ўвенчаліся поўным разгромам гітлераўскай Германіі, заявіўшай аб безагаворачнай капітуляцыі, устанавіць, што 9 мая з'яўляецца днём усенароднага таржэства—СВЯТАМ ПЕРАМОГІ.**

**9 мая лічыць не рабочым днём.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН

**Масква, Крэмль**
**8 мая 1945 года**

## Падпісанне акта аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх узброеных сіл

### *Акт аб ваеннай капітуляцыі*

1. Мы, ніжэйпадпісаўшыеся, дзейнічаючы ад імені Германскага Вярхоўнага Камандавання, згаджаемся на безагаворачную капітуляцыю ўсіх нашых узброеных сіл на сушы, на моры і ў паветры, а таксама ўсіх сіл, якія знаходзяцца ў сучасны момант пад нямецкім камандаваннем,—Вярхоўнаму Галоўнакамандаванню Чырвонай Арміі і адначасова Вярхоўнаму Камандаванню Саюзных экспедыцыйных сіл.

2. Германскае Вярхоўнае Камандаванне неадкладна выдасць загады ўсім нямецкім камандуючым сухапутнымі, марскімі і паветранымі сіламі і ўсім сілам, якія знаходзяцца пад германскім камандаваннем, спыніць ваенныя дзеянні ў 23.01 гадзіны па цэнтральна-еўрапейскаму часу 8-га мая 1945 года, застацца на сваіх месцах, дзе яны знаходзяцца ў гэты час і поўнасцю раззброіцца, перадаўшы ўсю іх зброю і ваенную маёмасць мясцовым саюзным камандуючым або афіцэрам, якія вылучаны прадстаўнікамі Саюзнага Вярхоўнага Камандавання, не разбураць і не ўтвараць ніякіх пашкоджанняў параходам, суднам і самалётам, іх рухавікам, карпусам і абсталяванню, а таксама машынам, узбраенню, апаратам і ўсім наогул ваеннатэхнічным сродкам вядзення вайны.

3. Германскае Вярхоўнае Камандаванне неадкладна вылучыць адпаведных камандзіраў і забяспечыць выкананне ўсіх далейшых загадаў, выданых Вярхоўным Галоўнакамандаваннем Чырвонай Арміі і Вярхоўным Камандаваннем Саюзных экспедыцыйных сіл.

4. Гэты акт не будзе з'яўляцца перашкодай для замены яго другім генеральным дакументам аб капітуляцыі, заключаным Аб'еднанымі Нацыямі або ад іх імені, прыстасаваным да Германіі германскіх узброеных сіл у цэлым.

5. У выпадку, калі нямецкае Вярхоўнае Камандаванне альбо якія небудзь узброеныя сілы, якія знаходзяцца пад яго камандаваннем, не будуць дзейнічаць у адпаведнасці з гэтым актам аб капітуляцыі, Вярхоўнае Камандаванне Чырвонай Арміі, а таксама Вярхоўнае Камандаванне Саюзных экспедыцыйных сіл, прадпрымуць такія карацельныя меры, альбо другія дзеянні, якія яны палічуць неабходнымі.

6. Гэты акт складзен на рускай, англійскай і нямецкай мовах. Толькі рускі і англійскі тэксты з'яўляюцца аўтэнтычнымі.

Падпісана 8 мая 1945 года ў гор. Берліне.

Ад імені Германскага Вярхоўнага Камандавання:
**Кейтэль, Фрыдэбург, Штумпф.**

У прысутнасці:

**Па Упаўнаважанню Вярхоўнага Галоўнакамандвання Чырвонай Арміі Маршала Совецкага Саюза**
**Г. ЖУКАВА**

**Па Упаўнаважанню Вярхоўнага Камандуючага экспедыцыйнымі сіламі саюзнікаў Галоўнага Маршала авіяцыі**
**ТЕДЭРА**

Пры падпісанні таксама прысутнічалі ў якасці сведкаў:

Камандуючы стратэгічнымі паветранымі сіламі ЗША генерал
**СПААТС**

Галоўнакамандуючы французскай арміяй генерал
**ДЕЛАТР ДЭ ТАССІНЫ**

## *У Соўнаркоме СССР*

У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб аб'яўленні 9 мая СВЯТАМ ПЕРАМОГІ Соўнарком СССР пастанавіў лічыць 9 мая 1945 года не рабочым днём.

***

Совет Народных Камісараў СССР прапанаваў усім совецкім дзяржаўным установам 9 мая г. г. у дзень усенароднага таржэства — СВЯТА ПЕРАМОГІ падняць на сваіх будынках Дзяржаўны Сцяг Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

